ПРАБЛЕМА І РАШЭННЕ

# ЁСЦЬ НАРМАТЫВЫ, АЛЕ ЗАСТАЮЦЦА БАР'ЕРЫ

## Людзі з абмежаванымі магчымасцямі не хочуць прасіць дапамогі ў навакольных



**І не таму, што гэту дапамогу не атрымаюць. Наадварот. Многія імкнуцца дапамагчы ў такіх сітуацыях. Але самі інваліды лічаць, што такую магчымасць павінна забяспечваць дзяржава. Нездарма Беларусь у 2016 годзе ратыфікавала Канвенцыю па правах інвалідаў, якая гарантуе роўныя правы для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Як такую ўстаноўку вырашаюць дэпутаты і мясцовыя ўлады Гродна?**

### Каб адправіцца ў паездку...

Алена Бельская любіць куды-небудзь паехаць, хоць і перасоўваецца на інваліднай калясцы. Часам вандроўкі пакідаюць не самае лепшае ўражанне, асабліва гэта датычыцца дальніх паездак. Таму усё, што палягчае такія вандроўкі, Алена сустракае радасна. А нядаўна яна даведалася пра новую магчымасць, якую даюць гродзенскія чыгуначнікі. Аказваецца, трапіць у вагон можна на спецыяльным пад'ёмніку. Ды і вагон таксама спецыяльны — у купэ ўсё прадугледжана для камфортнай паездкі чалавека з інваліднасцю.

Пакуль Алена не мела магчымасці праехаць у такім вагоне, але змагла ацаніць зручнасць пад'ему ў яго. І такіх спецыяльных вагонаў на станцыі «Гродна» амаль 30. Адзін з іх у цягніку, які ідзе ў Маскву.

— Людзям у інвалідных калясках дапамогуць з пад'ёмнікам работнікі вакзала альбо брыгада цягніка, а інфармацыя пра паездку перадаецца як на станцыю адпраўлення, так і ў пункт прыбыцця незалежна ад таго, у Беларусі гэты населены пункт альбо за мяжой, — патлумачыла **начальнік вакзала Валянціна МІКУЦКАЯ.**

Праўда, ёсць даволі важны нюанс. Для арганізацыі паездкі неабходна зрабіць заяўку не менш чым за пяць сутак да рэйса. У іншым выпадку цяжка гарантавана трапіць у такое спецыяльнае купэ. А попыт ёсць: людзі ў інвалідных калясках ездзяць на спаборніцтвы, розныя мерапрыемствы, сустрэчы. Напрыклад, цяпер ім намнога зручней дабрацца да Мінска. У цягніку ёсць адмысловыя месцы для інвалідаў, таму не абавязкова заказваць спецыяльнае купэ, і час адпраўлення зранку з Гродна даволі зручны.

На самім вакзале, паведаміла Валянціна Мікуцкая, безбар'ернае асяроддзе забяспечваюць дзевяць пунктаў. Для выкліку супрацоўніка вакзала можна скарыстацца спецыяльным радыёпультам. Перад уваходам у вакзал ёсць ліфт.

### У паліклініку і на боўлінг

Паліклінікі і аптэкі людзі ў інвалідных крэслах наведваюць часцей за ўсё. «Безбар'ерна» дабрацца да ўрача робіцца больш зручна. Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама, члена Савета Рэспублікі Алены КРАТКОВАЙ,** работа ідзе над тым, каб усе медыцынскія ўстановы вобласці былі абсталяваны пандусамі, ліфтамі, спецыяльнымі санітарнымі вузламі. Гэтыя пытанні абавязкова ўлічваюцца пры рэканструкцыі і мадэрнізацыі бальніц і паліклінік.

З такім падыходам працуюць многія ўстановы культуры. Узорным у гэтым плане можна лічыць культурна-забаўляльны комплекс «Галактыка».

— Пакуль яшчэ рэдкасць, калі прыходзіць сам інвалід, — падкрэсліў **начальнік аддзела культуры Гродзенскага гарвыканкама Дзмітрый ВІЛЬЧЫК.** — У асноўным мы працуем з групамі. Трапіць у культурны цэнтр для чалавека ў інваліднай калясцы нескладана. Уваход абсталяваны пандусам, працуе ліфт, у боўлінгу ёсць спецыяльная дарожка з борцікамі. Пры неабходнасці, напрыклад, загрузкі ў аўтамабіль карыстаемся тэлескапічнымі пандусамі.

Юлія, якая працуе ў цэнтры сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў, расказала, што яна са сваёй падапечнай была ў цэнтры некалькі разоў. Галоўнае, каб было жаданне адкрываць нешта новае, тады і перашкод будзе менш, лічыць яна. Хоць даводзіцца браць у разлік кошт забаў — далёка не кожнаму інваліду такія траты па кішэні.

### З дапамогай дэпутата і камунальнікаў

Такі праект сёлета рэалізаваны ў гістарычным цэнтры горада. У кватэры, дзе жыве сям'я інвалідаў-калясачнікаў, па хадайніцтве дэпутата гарсавета ўстаноўлены пад'ёмнік. Гаспадар кватэры Васіль Галась неаднаразова звяртаўся ў розныя інстанцыі, пакуль за справу не ўзяўся дэпутат Сяргей Каляда. Яму ўдалося падключыць камунальныя службы, і справа зрушылася з месца.

Пад'ёмную платформу ўсталявалі з выхадам на балкон, бо сям'я пражывае на першым паверсе. І хоць пад'ёмнік нікому не перашкаджае, яго ўстаноўка заняла даволі працяглы час. Амаль год спатрэбіўся на ўзгадненне дакументаў у Міністэрстве архітэктуры і горадабудаўніцтва.

Паралельна вялася работа з жыхарамі пад'езда, якія павінны даць згоду на ўстаноўку аўтаномнага пад'ёмніка і далучэнне яго да агульнай сістэмы энергазабеспячэння. У цэлым магутнасць яго невялікая — 0,55 кілават-гадзін. Па словах **намесніка генеральнага дырэктара гарадскога ЖКГ Сяргея СЯМАШКІ,** праз вялікую колькасць узгадненняў такія пад'ёмнікі ў старым жылым фондзе паставіць вельмі складана. Перашкаджае і непрыстасаванасць саміх будынкаў. Найбольш даступны варыянт, па яго словах, гэта адкідныя пандусы. Іх устаноўлена пакуль шэсць, яшчэ столькі ж — тэлескапічных. У горадзе пяць аб'ектаў з пад'ёмнымі платформамі.

Сёлетняя праграма па безбар'ерным асяроддзі ў горадзе выканана, паведаміў Сяргей Сямашка, але разглядаецца пытанне аб выдзяленні дадатковых сродкаў яшчэ на 14 аб'ектаў. Усяго ў органы мясцовай улады пададзена 50 заявак па стварэнні безбар'ернага асяроддзя. Больш за ўсё праблем датычыцца менавіта жылой забудовы старой часткі горада. Да таго ж многія прапановы спецыялістаў вельмі доўга ўзгадняюцца ў вышэйшых інстанцыях — гэта робіцца перашкодай у пошуку аптымальнага варыянта.

**❍ НАША ДАВЕДКА**

**У Гродзенскай вобласці жыве каля 63 тысяч чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, з іх амаль 18 тысяч — у Гродне. У СШ № 38 функцыянуе пяць інтэграваных класаў для дзяцей з ДЦП.**



### Нормы нахілу вызначаны

Сучасныя жылыя забудовы ўзводзяцца з улікам новых безбар'ерных нарматываў. Напрыклад, у шматпавярховіку мікраараёна Фолюш пад'ёмнік устаноўлены без усялякіх заявак. Гэта звязана з тым, што патрабаванні да безбар'ернага асяроддзя ў жылым фондзе значна змяніліся. Такая работа пачалася ў 2010 годзе, калі ў праектах сталі прапісвацца нормы па пандусах. Далей — больш. Ужо летась праекты прадугледжвалі пад'ёмную платформу, калі вышыня пандуса перавышае дапушчальную норму ў 0,6 метра. Так, у Гродне сёлета з'явіліся тры шматпавярховікі з пад'ёмнымі платформамі. Па такім прынцыпе цяпер ідзе забудова новага гродзенскага мікраараёна Грандзічы-2.

— Далёка не факт, што хоць у адной з кватэр новабудоўлі будзе жыць чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, — патлумачыла **намеснік упраўлення архітэктуры і горадабудавання гарвыканкама Вольга БАРЭЙКА.** — Але з нядаўняга часу гаворка ідзе пра стварэнне безбар'ернага асяроддзя не толькі для людзей з інваліднасцю, але і ў цэлым для фізічна аслабленых жыхароў. Да гэтай катэгорыі можна аднесці сталых, часова непрацаздольных, цяжарных жанчын. Пад'ёмная платформа будзе зручная таксама для маці з дзіцячымі каляскамі, для малых дзяцей з роварамі.

Нарматыўная база датычыцца і дваровай тэрыторыі. Не павінна быць перападу паміж тратуарам і праезнай часткай каля пад'ездаў. Вызначаны нахіл прыступак і поручняў. Укладваецца тактыльная плітка. Вырашаецца пытанне аб праектаванні некалькіх кватэр для інвалідаў-калясачнікаў.

Новыя нормы безбар'ернага асяроддзя закладзены ў поўным аб'ёме і ў генеральны план Гродна, падрыхтаваны для зацвярджэння кіраўніку дзяржавы, падкрэсліла Вольга Барэйка.

### Бесперапыннае асяроддзе? Праблема...

У Гродне вызначаны галоўны кірунак — каб безбар'ернае асяроддзе не перарывалася. Чалавек у інваліднай калясцы павінен ад дзвярэй кватэры да месца прызначэння дабірацца без асаблівых перашкод. Па словах **старшыні Гродзенскага аб'яднання інвалідаў-калясачнікаў Сяргея ФЕШЧАНКІ,** для многіх праблемы пачынаюцца ўжо з парога. Адкідныя пандусы, якімі абсталяваны многія пад'езды, устаноўлены пад такім вуглом, як і лесвічны пралёт. А вугал нахілу бывае даволі вялікі, і пераадолець яго самастойна немагчыма.

Яшчэ адна праблема, якую агучыла **намеснік старшыні гарвыканкама Зоя КУЛЕША,** датычыцца сацыяльнага таксі. Вядома, добра, што ў горадзе працуе такі запатрабаваны транспарт, які можа падвезці чалавека з абмежаванымі магчымасцямі ў любы пункт горада. Напрыклад, за паўгода выканана 650 заявак ад 130 жыхароў. На гэтыя мэты выдаткавана 17 тысяч рублёў, столькі будзе асвоена ў другім паўгоддзі. Сацыяльнае таксі абсталявана пад'ёмнікам. Вось толькі скарыстацца сацыяльным таксі ўдаецца амаль праз тыдзень з моманту заяўкі. Калі казаць пра даступнасць такой паслугі, ёсць неабходнасць у набыцці яшчэ як мінімум двух аўтамабіляў, падкрэсліла Зоя Кулеша.

Далёка не ўсе паркоўкі абсталяваны месцамі для людзей у інвалідных калясках. Напрыклад, яны адсутнічаюць на стаянцы каля чыгуначнага вакзала. У многіх аб'ектах, у тым ліку паліклініках, бальніцах, не прадугледжаны спецыяльныя санітарна-гігіенічныя вузлы.

— Канешне, сённяшні стан адрозніваецца ад таго, што было яшчэ некалькі гадоў таму, многае зроблена, асабліва ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі, — адзначыў Сяргей Фешчанка. — Безбар'ернае асяроддзе ў горадзе прыкметнае — курсіруе нізкапольны транспарт, ёсць спецыяльныя электронныя табло, тактыльныя разметкі... Хацелася б паскорыць вырашэнне праблемы высокіх бардзюраў, што важна для чалавека ў інваліднай калясцы.

Пры гэтым кіраўнік таварыства інвалідаў заклікае не гнацца за колькасцю, а звярнуць больш увагі на якасць работы. Зрабіць менш, але дасканала.

Па словах Зоі Кулешы, у горадзе 63 % аб'ектаў часткова ці поўнасцю прыстасаваны да безбар'ернага асяроддзя. Многія элементы зроблены пасля звароту грамадзян, і людзі актыўна ўносяць заяўкі ў спецыяльную камісію. Сумесна з ДАІ адсочваюцца правілы паркоўкі. Штогод з гарадскога бюджэту выдзяляецца 50 тысяч рублёў на праграму безбар'ернага асяроддзя. Безумоўна, гэтага недастаткова, таму многія ўстановы самі ствараюць даступнасць для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, напрыклад медыцынскія, сацыяльныя, гандлёвыя аб'екты.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

**Віктар ЛІСКОВІЧ, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама, дэпутат абласнога Савета дэпутатаў:**

*— У стварэнні безбар'ернага асяроддзя важна рухацца крок за крокам, не спыняцца ні на хвіліну. Як гэта зрабіць? Трэба браць канкрэтны аб'ект і дабівацца там даступнага асяроддзя. Узорнымі ў гэтым кірунку павінны стаць нашы знакавыя аб'екты, якія будуць здавацца ў хуткім часе, — новая бальніца ў Астраўцы, універсітэцкая клініка і анкалагічны цэнтр. Да прыёмкі аб'екта плануем далучаць непасрэдна тых, хто мае інваліднасць. Наша задача — стварыць роўныя магчымасці ўсім нашым жыхарам, не рабіць ласку, а разумець, што гэта нармальнае жыццё.*